semantic volume in different historical periods; establishes the structural and semantic originality of the word *dance* compared with the words close in meaning. The work is based on the National Corpus of the Russian language and lexicographic sources of various types.

**Keywords:** dance, semantics, history of the Russian language, etymology.

УДК 811.161.3’42’371:821.161.3-3*Шамякін

**С. С. Шкудун**
Навуковы кіраўнік – **Т. А. Фіцнер**,
канд. філал. навук, дацэнт

## КАНЦЭПТ «КАХАННЕ» Ў ТВОРЧАСЦІ І. ШАМЯКІНА

**Анатацыя.** У артыкуле аналізуецца мастацкі канцэпт «каханне», які адлюстроўвае адну з духоўных рэалій моўнай рэчаіснасці, і яго суб’ектыўныя асаблівасці ў творчасці Івана Шамякіна. Прадстаўлены канцэптуальныя складнікі кахання, паказана іх індывідуальнае ўвасабленне ў кантэксце твораў І. Шамякіна розных гадоў. Даследаванне дазволіла дапоўніць уяўленне пра гэты ўніверсальны канцэпт, раскрыць новыя эмацыянальна-сэнсавыя грані ў творчасці пісьменніка.

**Ключавыя словы:** каханне, канцэпт, агульначалавечыя ўніверсаліі, мастацка-вобразны змест, сэнсавыя складнікі, Іван Шамякін, беларуская літаратура XX ст.

Каханне з’яўляецца семантычна шырокім паняццем. Яго вызначаюць як «форму духоўнай культуры» і разумеюць «як індывідуальнае перажыванне пачуцця адданасці, калі аб’ект гэтага пачуцця робіцца вышэйшым і больш каштоўным за асабістае “Я” і без яднання з выбраным аб’ектам чалавек не ўяўляе свайго існавання ці, па меншай меры, адчувае глыбокую незадаволенасць, непаўнату індывідуальнага быцця» [1, с. 206]. Згодна з пункту гледжання А. Л. Садоўскай, каханне ёсць канстанта сусветнай культуры. Яно сумежнае з сімпатыяй, павагай, рэўнасцю, здрадай, абыякавасцю, нянавісцю і да т. п., таму семантычны яго бок вызначаецца «пэўнай шматпланавасцю, сінкрэтызмам і дыфузнасцю» [2, с. 317].

Можна вылучыць наступныя прыкметы кахання:

− каханне можа вымярацца па розных параметрах, напрыклад, якасці, сталасці/нясталасці (*моцнае каханне, бязмежнае каханне, юнацкае каханне, сталае каханне*);

− каханне можа прыносіць пакуты (*няшчаснае каханне, безадказнае каханне*);

− каханне можа быць сапраўдным і бескарыслівым (*вечнае каханне, шчырае каханне*);

РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМЕНИ Ф. СКОРИНЫ

– каханне можа быць абвостраным і набліжацца да страсці (*гарачае каханне, неўтаймоўнае каханне*);

– закаханы імкнецца падарыць нешта аб’екту кахання (*у імя кахання*);

– каханне можна заслужыць (*заваяванае, заслужанае каханне*) [1].

Працэс канцэптуалізацыі ўяўляе сабой працэс структуравання свету і дазваляе зводзіць шматстайнасць навакольных з’яў да змястоўных адзінак свядомасці.

Існуе шэраг падыходаў да канцэптаў, якія прапаноўваюць розныя аўтары. Да іх можна аднесці наступныя:

а) канцэпт – гэта ідэя, якая ўключае абстрактныя, канкрэтна-асацыятыўныя і эмацыянальна-ацэначныя прыкметы, а таксама спрэсаваную гісторыю паняцця;

б) канцэпт – асабістае асэнсаванне, інтэрпрэтацыя аб’ектыўнага значэння і паняцця як змястоўнага мінімума значэння;

в) канцэпт інтэрпрэтуецца як сутнасць паняцця, якая рэалізуецца ў сваіх змястоўных формах: у вобразе, паняцці і ў сімвале [2].

Канцэпт «каханне» з’яўляецца неад’емным фрагментам моўнай карціны свету і займае адну з асноўных пазіцый у сістэме нацыянальных каштоўнасцей. Разгляд агульначалавечых універсалій, да якіх адносіцца і каханне, а таксама іх спецыфікі у творчасці пэўнага пісьменніка садзейнічае разуменню культуры і светабачання ўсяго народа.

Вялікая ўвага надаецца першаму пачуццю закаханасці ў апавяданнях І. Шамякіна («Вясновымі днямі», «Першае спатканне», «Непрыгожая» і інш.), дзе паказаны працэс усталявання самых высокіх і чыстых пачуццяў ва ўмовах недастатковага жыццёвага вопыту. Герой апавядання «Вясновымі днямі» (1953) Яўмен шчыра і па-сапраўднаму закахаўся ў дзяўчыну Надзю. Першае глыбокае пачуццё выклікае вялікі эмацыянальны ўсплёск у душы героя, робіць яго лепшым, больш працавітым і адказным. Т. В. Бельская адзначае: «Маральна-грамадзянскае і эмацыянальна-ўзроставае сталенне маладога чалавека падаецца аўтарам як выпрабаванне на чалавечнасць і высакародства» [3, с. 6].

У апавяданні «Першае спатканне» (1953) таксама паказана нараджэнне першага пачуцця. Уся ўвага пісьменніка засяроджана на перажываннях галоўнага героя, на эмацыянальна-псіхалагічным стане закаханага хлопца. Пры гэтым І. Шамякін падкрэслівае «звычайнасць перажыванняў галоўнага героя, аднак саму паўсядзённасць, звычайнасць, духоўную сутнасць жыцця чалавека пісьменнік умее паказаць так, што ўзнікае ўражанне надзвычайнай маральнай значнасці ўчынкаў героя» [3, с. 6].

А. С. Кавалюк называе тэму кахання адной з самых вызначальных ва ўсёй творчасці І. Шамякіна. Даследчыца піша: «Празаік настойліва пераконваў чытача, што каханне, сям’я – гэта самае трывалае апірышча чалавека, тое, што напаўняе яго жыццё сэнсам. Зведаўшы сапраўднае каханне, І. Шамякін лічыў яго найдаражэйшым багаццем. У сваіх творах пісьменнік

РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМЕНИ Ф. СКОРИНЫ

паказаў, што, кахаючы, чалавек пераўтвараецца, становіцца лепшым, у ім адкрываецца вялікі душэўны і духоўны патэнцыял» [4, с. 52].

Гарманічнасць асабістага сямейнага жыцця, заснаваная на глыбокай духоўнай еднасці мужа і жонкі, стала асновай стварэння многіх літаратурных вобразаў у аповесцях і раманах І. Шамякіна. Вобраз каханай на ўсё жыццё жонкі, спадарожніцы праз доўгія гады, паплечніцы і шчырай памочніцы прысутнічае ў аўтабіяграфічнай аповесці «Непаўторная вясна» (1957), раманах «Вазьму твой боль» (1979), «Атланты і карыятыды» (1974) і многіх іншых. У сваіх творах І. Шамякін свядома прапагандаваў гармонію сямейных стасункаў, бо бачыў у гэтым глебу для выхавання духоўна моцнай асобы.

З розных пазіцый раскрываецца канцэпт «каханне» ў рамане І. Шамякіна «Сэрца на далоні» (1964) [5]. Узгадваючы вылучаныя намі прыкметы кахання, мы можам знайсці прыклады да кожнай з іх. Так, нясталае каханне характэрна для прадстаўнікоў маладога пакалення (няўпэўненасць Тараса Ганчарова ў выбары, ветранасць Машы, паспешлівая адданасць Нінкі). Адны пакуты прынесла каханне Славіку, які з-за дзяўчыны ледзь не скончыў жыццё самагубствам; яго каханне можна назваць і страсным, неўтаймоўным. Гэтак жа страсна кахае свайго мужа Галіна Яраш, але ўсё жыццё яна пакутуе ад беспадстаўнай рэўнасці, атручваючы тым самым і жыццё іншых членаў сям'і. Сапраўднае, шчырае каханне назіраецца ў сям'і Шыковічаў. У цэлым адносіны ў гэтай сям'і можна ахарактарызаваць як адкрытыя і вельмі эмацыянальныя. Прычым іх эмацыянальнасць часам мае і негатыўны кірунак, у парыве гневу яны могуць абражаць адзін аднаго, выказваць крыўду. Нягледзячы на гэта, не ўзнікае сумневаў у тым, што сям'я Шыковічаў вельмі дружная і шчаслівая. У іх няма патрэбы хаваць ад блізкіх свае пачуцці, няма сакрэтаў адзін ад аднаго, свае крыўды, хваляванні і страхі яны не назапашваюць, а агучваюць адразу. Так робяць толькі тыя, хто ўпэўнены, што яго зразумеюць і падтрымаюць. Асновай любові ў сям'і Шыковічаў з'яўляюцца не гучныя прыгожыя словы, а сапраўдная духоўная блізкасць.

У рамане «Злая зорка» [6] (1991) каханне паказана І. Шамякіным як жыццёва важнае пачуцце, у якім заключаны сэнс жыцця. Яно даецца чалавеку як асаблівы дар, без якога нельга адолець жыццёвыя выпрабаванні. Каханне Ірыны і Глеба – ўзнёслае і зямное, светлае і сумнае, радаснае і трагічнае. Іх пачуцці, якія развіваюцца на фоне Чарнобыльскай катастрофы, – гэта і найвялікшае шчасце, і цяжкі крыж, трагедыя. Праз вобраз Глеба Пыльчанкі Шамякін паказвае чалавека, у якога душа баліць за сваю працу і за бяспеку народа. Бо толькі вельмі адказны і неабыякавы да сваёй працы і народа чалавек можа ўцячы нават са свайго вяселля, даведаўшыся пра катастрофу. Глеб ведаў, наколькі гэта небяспечна, але дапамогу энэргетыкам на станцыі лічыў сваім абавязкам. Яго маладая жонка Ірына таксама вельмі смелая, незалежная і моцная духам дзяўчына, якая ўмее годна трымацца ў любых абставінах. Разам з маці Глеба

РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМЕНИ Ф. СКОРИНЫ

яны пайшлі пешшу са сваёй вёскі да чарнобыльскай станцыі, каб паглядзець, як у яго справы. У гэтым праяўляецца сіла кахання жонкі да мужа і любові маці да сына.

Такім чынам, каханне разумеецца як моцнае пачуццё глыбокай прыхільнасці, праява сардэчнай схільнасці, пастаяннае глыбокае і шчырае эмацыянальнае імкненне да другой асобы. Каханне ў творчасці І. Шамякіна паказана з розных пазіцый: каханне – самае галоўнае ў жыцці чалавека, сапраўднае, шчырае каханне заўсёды ўсё пераадольвае; каханне здольна натхняць закаханых на розныя подзвігі, яно надае сілы для пераадолення цяжкасцей. Галоўнымі кампанентамі кахання выступаюць у канцэпцыі І. Шамякіна савет, лад, узаемаразуменне, вернасць.

## Спіс выкарыстаных крыніц


1. Зализняк, А. А. Любовь и сочувствие: к проблеме универсальности чувств и переводимости их имён / А. А. Зализняк, И. Б. Левонтина, А. Д. Шмелёв // Языки славянской культуры. – М., 2005. – С. 205–217.
2. Садоўская, А. Л. Фразасемантычнае поле «каханне» ў беларускай мове / А. Л. Садоўская // «Мова – Літаратура – Культура» : матэрыялы VI Міжнароднай навуковай канферэнцыі ў 2-х частках. Ч. 1. – Мінск : РІВШ, 2011. – С. 316–324.
3. Бельская, Г. В. Маладосць і каханне ў апавяданнях Івана Шамякіна / Г. В. Бельская // София : электронный научно-просветительский журнал. – 2016. – № 1. – С. 4–16.
4. Кавалюк, А. С. Проза Івана Шамякіна 70-х гадоў: жанрава-стылёвая спецыфіка, канкрэтна-гістарычны і аксіялагічны змест / А. С. Кавалюк // Веснік Брэсцкага універсітэта. Серыя 3. Філалогія. Педагогіка. Псіхалогія. – 2019. – № 2. – С. 50–55.
5. Шамякін, І. Сэрца на далоні / І. Шамякін. – Мінск : Маст. літ., 2007. – 542 с.
6. Шамякін, І. Злая зорка / І. Шамякін // І. Шамякін. Збор твораў. – Т. 6. – Мінск : Маст. літ., 2005. – С. 5–306.



**Abstract.** The article analyzes the artistic concept of «love», reflecting one of the spiritual realities of linguistic reality, and its subjective features in the work of Ivan Shamyakin. The conceptual components of love are presented, their individual embodiment is shown in the context of I. Shamyakin's works of different years. The research allowed us to supplement the idea of this universal concept, to reveal new emotional and semantic facets in the writer's work.



**Keywords:** love; concept; universal human universals; artistic and figurative content; semantic components; Ivan Shamyakin; Belarusian literature of the twentieth century.


РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМЕНИ Ф. СКОРИНЫ